Д.А. Доўгаль (Магілёў)

АДРАСАТЫЎНЫЯ ФОРМЫ Ў ЭПІСТАЛЯРНАЙ СПАДЧЫНЕ Я. КУПАЛЫ

Як адзначаюць лінгвісты, "спрадвечную беларускую моўную культуру перш за ўсё адрозніваюць спосабы звароту да адрасата (суразмоўцы)" [1, с. 50], ці адрасатыўныя формы (далей АФ), пад якімі мы разумеем не толькі ўласна вакатывы, але і любую намінацыю адрасата ў канкрэтным маўленчым акце. Назіранне за лексічнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі асаблівасцямі АФ ліставання Я. Купалы, якое ахоплівае перыяд з 1909 да 1942 г., дае нам магчымасць прасачыць за станаўленнем беларускай эпісталярнай нормы ў 10 – 40-х гг. XX ст.

На пачатку творчага шляху ў беларускамоўных пасланнях Купала выкарыстоўвае пераважна такую канструкцыю: атрыбутыўны кампанент (*вельмі паважаны, шаноўны, даражэнькі* і інш.) + вакатыў (*Пане/Паночку*) + назоўнік-намінатыў пасады/звання (*Рэдактар, Прафесар*): *Паночку, Шчыра-паважаны Паночку, Шаноўны пане рэдактар*. У якасці вакатыва ў гэтых формулах выкарыстоўваецца запазычанае з польскай мовы тытулаванне, якое, тым не менш, прыстасавалася да беларускага маўлення ў ласкальным дэрываце *Паночку*. Адзначым, што апошняе ўжыванне Купалам такой АФ датуецца 1922 г. Замест яе з сярэдзіны 20-х гг. у афіцыйных лістах у рэдакцыі газет паэт пачынае ўжываць савецкі зварот *Таварыш – Паважаны т. рэдактар, Дарагі тав. рэдактар*.

Яшчэ адной асаблівасцю ранніх пасланняў Купалы з'яўляецца ўжыванне вакатываў *дзядзька, дзядзькі* ў адносінах да не-сваякоў. Спрэчным падаецца меркаванне, што такая АФ выступае толькі як "зварот да людзей сталага веку" [1, с. 51]. Прыклады з эпісталярнай спадчыны Купалы дазваляюць зрабіць выснову, што выкарыстанне гэтай формулы больш шырокае: *Дзядзька Тарас!* (з ліста да Б. Тарашкевіча) – зварот да чалавека, які маладзейшы за

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адрасанта і мае ўсяго 23 гады, але справа, якою той займаецца – складанне беларускай граматыкі – важная і пачэсная; *Вельмі паважаныя дзядзькі!* (з ліста ў рэдакцыю газеты "Дзянніца") – да групы мужчын (сярод іх – галоўны рэдактар Цішка Гартны, маладзейшы за Купалу на 5 гадоў), якія робяць першую савецкую газету па-беларуску. Таму трэба пагадзіцца з меркаваннем, што вакатывы *цётка, дзядзька* выконвалі ў маўленні ролю сацыяльнага рангавання, ужываліся як зваротак да старэйшага, да носьбіта высокага статусу, да вельмі шанаванага чалавека [4, с. 40].

Звяртае на сябе ўвагу сістэма іменавання асобы. Апелятыў *імя+імя па бацьку* замацаваўся "ў беларускім маўленчым этыкеце пазней, чым у рускім, і над уплывам апошняга. Нездарма ў беларускай мове няма аднаслоўнага эквіваленту для рускага слова *отчество*" [2, с. 97]. Разнамоўная эпісталярная спадчына Я. Купалы ярка дэманструе гэту асаблівасць. У той час як у лістах, напісаных па-руску, паэт звяртаецца да старэйшых за сябе, шанаваных адрасатаў па імені, імені па бацьку з 1910 г. (*Лев Максимович, Федор Федорович* і г.д.), у беларускамоўных пасланнях такой формы звароту не сустракаецца да 1929 г.

На сінтаксічным узроўні ў ліставанні Купалы таксама варта адзначыць наяўнасць *Ты*-мадэлі (2-я асоба адзіночнага ліку) і *Вы*-мадэлі (2-я асоба множнага ліку) звароту да адрасата, выбар адной з якіх абумоўлены сацыяльнай дыстанцыяй, розніцай ва ўзросце, афіцыйнасцю маўленчай сітуацыі, паважлівым стаўленнем да адрасата і іншымі фактарамі: *Перадай маё самае шчырае і сардэчнае спачуванне* [3, с. 324] – *Напішыце, вельмі паважаны і даражэнькі паночку, што чуваць у Вас і ў Суполцы* [3, с. 231]. Аднак у ранніх лістах Песняра сустракаецца зварот да адрасата ў 3-й асобе, выкліканы ўплывам польскай мовы: *Калі мне ўдасца перапісаць на машынцы ў колькі экземплярах, то дарагому п. прафесару прышлю адзін экземпляр для прагляду* [3, с. 230].

Адметнасцю беларускага маўленчага этыкету з'яўляецца актыўнасць "ласкальных" стэрэатыпаў, што адлюстроўваецца і ў АФ, выкарыстаных Купалам. Паэт ужывае ў зваротах лексемы з коранем *–ласк–*: *Я хацеў бы запытацца Вашай ласкі, што добрага чутно аб маёй справе?* [3, с. 225]; словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі: *Паночку, Алеська, Владка.* Яркую ілюстрацыю гэтай асаблівасці беларускай этыкетнай сістэмы змяшчае ліст да Л.М. Клейнбарта [3, с. 279], у якім аўтар звяртаецца да адрасата па-руску *Глубокоуважаемый и дорогой Лев Максимович!* і па-беларуску *Жадаю Вам усяго найлепшага, даражэнькі Леў Максімавіч.*

Такім чынам, назіранне за асаблівасцямі АФ дазваляе вылучыць у купалаўскім ліставанні два перыяды: беларускі з польскамоўным уплывам (да сярэдзіны 20-х гг.) і беларускі савецкі. У рамках адной эпісталярнай спадчыны мы можам адзначыць змену этыкетнай лістоўнай нормы. Гэта выяві-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лася, з аднаго боку, у знікненні лексічных і сінтаксічных паланізмаў, а таксама традыцыйных зваротаў з вакатывам *дзядзька,* з другога – у пашырэнні рускамоўнага (савецкага) уплыву, а менавіта ў выкарыстанні двухчленных апелятываў-антрапонімаў і новага вакатыва *таварыш.*

Літаратура

1. **Важнік, С.А.** Моўны этыкет беларусаў: ветлівыя звароты / С.А. Важнік // Роднае слова. – 2008. – № 2. – С. 50-51.
2. **Канюшкевіч, М.** Лінгвасеміятычныя апазіцыі ў люстэрку беларускага маўленчага этыкету: колькасныя параметры / М. Канюшкевіч // Роднае слова. – 1999. – № 10. – С. 95-100.
3. **Купала, Я.** Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 9. Кн. 1. / Я. Купала. – Мн.: Маст. літ., 2003. – 686 с.
4. **Піваварчык, Т.** "Братка беларус...": Роднай мовы чулыя і ветлівыя словы / Т. Піваварчык // Роднае слова. – 2002. – № 9. – С. 39-42.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова